Падтрымай "Вясну" на PATREON

Чыноўнікі не ўключылі Рамана Кісляка ў акруговую камісію, бо не ведаюць статуса “праваабаронца” дапоўнена

03.09.2019 **Тэгі**: выбары-2019



Пасяджэнне па фармаванні Брэсцкай абласной выбарчай камісіі

У Брэсце другога верасня сфармавалі абласную і акруговыя выбарчыя камісіі. Сюрпрызаў не адбылося: прадстаўнікі дэмакратычных структур апынуліся за бартом выбарчых камісій. Акрамя прадстаўнікоў "Справядлівага Свету".

На супольнае пасяджэнне Брэсцкага аблвыканкама і Прэзідыўма Брэсцкага абласнога Савета дэпутатаў па фармаванні абласной выбарчай камісіі змаглі патрапіць усяго некалькі чалавек: прэтэндэнты ў сябры камісій і кіраўніцтва некаторых партый і арганізацый, што вылучалі прэтэндэнтаў. Звычайных выбаршчыкаў і блогераў ахова не пусціла ў будынак аблвыканкама, тлумачачы гэта тым, што іх “у спісах няма".

У склад абласной і АВК не ўключалі некаторых вылучэнцаў ад праўладных структур на той падставе, што яны “загружаны па месцы працы”, маюць “сталы ўзрост”, “праблемы са здароў’ем”, “па сямейных абставінах”. З большага ў камісіі былі ўключаныя праваныя на ранейшых выбарах людзі, пераважна дзеючыя і былыя работнікі аблвыканкама і адміністрацый горада. Шляхі вылучэння ад праўладных грамадзкіх арганізацый (Белая Русь, БРСМ, Саюз Жанчын, Чырвоны Крыж, арганізацыі разнастайных ветэранаў і праўладных прафсаюзаў), Партыі працы і справядлівасці, ЛДП і ад грамадзян.

У склад абласной камісіі (ТВК) не ўключылі прадстаўніка Руху "За Свабоду" **Сяргея Вакуленку**, бо не мелі дастатковай інфармацыі пра ягоныя дзелавыя якасці і арганізатарскія здольнасі. Па той жа прычыне (недастаткова інфармацыі) у камісію не была ўключана сябра “Гавары Праўду" **Анхеля Бланко**. З апазіцыйных прэтэндэнтаў была ўключана толькі **Волкава М.А.** ад Беларускай партыі левых "Справядлівы Свет" (ужо была ў камісіі ў 2012 годзе).

У параўнанні з выбарамі ў Палату прадстаўнікоў 2016 года склад абласной камісіі мала змяніўся. У 2016 годзе ў кіраўніцтве абласной камісіі намеснікам старшыні была **Наталля Грыгор’ева**, сакратаркай – **Алена Шамкуць**. Гэтым разам гэтыя сама асобы ізноў уключаныя ў склад камісіі, да іх далучыўся **Аляксандар Каляда**, які раней працаваў у выканкаме і стала займаўся выбарамі, нават быў сябрам ЦВК.

Варта адзначыць, што напярэдадні паседжання па фармаванні абласной камісіі дзевяць жыхароў Берасцейшчыны звярнуліся ў аблвыканкам з просбай не ўключаць у склад камісіі 13 грамадзян, якія фальсіфікавалі выбары ў 2006 годзе. Сярод гэтых 13 былі прозвішчы Грыкор’евай, Шамкуць і Каляды. Аднак як бачым, заява ніяк не змяніла сітуацыю.

Праваабаронцу **Раману Кісляку**, які з’яўляецца сябрам Руху “За свабоду”, адмовілі ва ўключэнні ў склад акруговай камісіі №1 Брэста. Падстава тая ж: няма дастатковай інфармацыі аб ягоных дзелавых якасцях. Раман Кісляк назваўся "праваабаронцам", але чыноўнікі выканкаму адказалі, што не ведаюць такога статуса, і праз гэта лічаць, што ён падаў недаставерныя дадзеныя. Затое ў гэтую камісію трапіў **А.Ф. Дзенісенка** ад Беларускай партыі левых "Справядлівы Свет".

На папярэдніх парламенцкіх выбарах у кіраўніцтве АВК 1 старшынём была Тамара Наўмовец, намеснікам **Людзміла Капусціна**, сакратаром **Таццяна Вайцэкенес**. Гэтым разам гэтыя сама асобы ізноў уключаныя ў склад АВК 1.

У склад выбарчай камісіі Брэсцкай-Цэнтральнай выбарчай акругі № 2 не ўключылі вылучэнцаў ад апазыцыйных структур на той падстве, што: **Босак Н.П.** ад Беларускай партыі левых "Справядлівы Свет" не прадставіў дадзеных аб досведзе працы і здольнасцях, а **Ліцвінка І.С.** ад ПБНФ не працуе.

У акруговаў выбарчай камісіі №2 асобы, якія былі ў кіраўніцтве камісіі ў 2016 годзе зноў былі ўключаны ў склад камісіі. Старшыня – **Галіна Янголенка**, сакратарка – **Інна Акімава**.

У склад выбарчай камісіі Брэсцкай-Усходняй выбарчай акругі № 3 не ўключылі: **Захаранка Л.А.**, вылучаную "Рухам "За Свабоду", бо, па меркаванні чыноўнікаў, "наяўная інфармацыя не адлюстроўвае яе асабістых і практычных якасцяў"; **Ігумнава Г.**, вылучанага БСДП “Грамада”, бо "няма дадзеных аб дзелавых якасцях" і не ўказаў, што ён "працуючы пенсіянер”; **Чіпурных Л.А.** ад Беларускай партыі левых "Справядлівы Свет", бо не знайшлі дадзеных аб ягоных дзелавых якасцях. Кіраўнік абласной арганізацыі **Людміла Дзенісенка** абурылась: “Ён маёр, мае дзяржаўныя ўзнагароды! Не маглі ў ваенкамат звярнуцца?!” Яе пытанне засталось без адказу.

У склад АВК №3 увайшлі **Марыя Колбік**, **Аксана Дутчык**, **Ірына Хазей**, якія былі і ў мінулай камісіі па парламенцкіх выбарах.


"Праваабаронцы за свабодныя выбары"

Навіны кампаніі ў фэйсбуку, твітэры і на Тэлеграм-канале.

Твитнуть








Жыхарку Фаніпаля асудзілі за ўдзел у акцыі пратэсту з белымі кветкамі і шарыкамі

"Беларусі пахваліцца няма чым". У Вене прайшла кансультацыя пра мірныя пратэсты

Герб на акне, Курапаты і дзесяцігадовы малюнак. Тры справы супраць Беларусі, зарэгістраваныя ў КПЧ ААН

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА




Памёр палітзняволены мастак Алесь Пушкін (дапоўнена)

"Рэжымныя аб'екты — залатое дно". Былы палітвязень і юрыст "Вясны" — пра прамзону ў калоніі № 17

"Гэта бессэнсоўны акт прапаганды". Былы палітвязень ПК-17 пра сюжэт БТ пра яго калонію (фота)

"Кніга ў зняволенні – гэта больш чым кніга": што чытаюць беларусы ў СІЗА і калоніях?



Глядзіце, хто з беларусаў на фэсце "Тутака" сказаў "НЕ" смяротнаму пакаранню ў Беларусі фота







АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Такія пакутныя выпрабаванні прыпалі не толькі на долю праваабаронцаў, але і на долю ўсяго беларускага народу", – Наталля Пінчук

“Іх барацьба можа крануць любога, іх годнасць і мужнасць – урок для кожнага з нас”. Чаму замежныя творцы малююць палітвязняў Беларусі

Ператрус у Мінскай архікатэдры, новыя "экстрэмісцкія" фармаванні: хроніка пераследу 18 ліпеня

Агляд навінаў пра палітвязняў за мінулы тыдзень

Пратэстоўца самай масавай акцыі ў Беларусі асудзілі па фота ў Instagram

За злоснае непадпарадкаванне адміністрацыі калоніі палітвязню дадалі яшчэ паўгады зняволення

Мужчыну асудзілі на год калоніі за інтэрнэт-каментар у бок міністра МУС і яго сына міліцыянта


Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні васьмі палітычных зняволеных

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Травень 2023

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022





Напрамкі дзейнасці

ПАРТНЁРСТВА

РАДЫЯ

СЯБРОЎСТВА

ENEMO






















E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY